

АД ВАДЫ ДА БЯДЫ — КРОК 4

У ТАЛЕНАВІТЫХ БАЦЬКОЎ — ТАЛЕНАВІТЫЯ ДЗЕЦІ 7



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 МАЯ 2024 г. СЕРАДА № 93 (30226)

## КОРАТКА

• Прадпрыемствы беларускай нафтахіміі падпісалі дакументы аб супрацоўніцтве з іранскімі калегамі на міжнароднай выставе нафты, газу і нафтахіміі Iran Oil Show.

• БМЗ па выніках I квартала павялічыў выпуск прадукцыі з найбольш высокім коштам — кругляга пракату і прадукцыі метызнай вытворчасці на тры працэнты і 15,1 працэнта адпаведна.

• Мінск і Пекін падпісалі праграму па развіцці супрацоўніцтва на 2024—2026 гады.

• Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў уведзены амаль у 100 раёнах Беларусі.



З першых вуснаў

# «Сёння сімволіка не толькі аб'ядноўвае, але і выступае крыніцай упэўненасці і ўнутранай сілы»

## Сапраўды ўсенародная традыцыя

**Май багаты на вялікія святы. Пасля 9 Мая краіна святкуе лагічны працяг Дня Вялікай Перамогі — Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна. І калі 9 Мая ўспамінаюць падзеі мінулых дзён, то 12-га ўсё накіравана на сучаснасць і на будучыню. Нездарма важнай часткай гэтага дня з'яўляецца рытуал ушанавання дзяржаўных сімвалаў, падчас якога маладыя беларусы прыносяць клятву на вернасць дзяржаўным сімвалам. Удзел у цырымоніі па традыцыі прымае і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што вельмі рады таму, што новая традыцыя ўрачыстага ўшаноўвання найважнейшых сімвалаў суверэннай Беларусі ў дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна трывала ўвайшла ў наша жыццё. СТАР. 2



Фота БелТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КЛІМЯНКОЎ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення інвестыцыйнай і будаўнічай дзейнасці Міністэрства эканомікі:**

*«Сёння пералік праграмы «Адзін раён — адзін праект» уключае 190 праектаў. Разам з тым работа па карэкціроўцы пераліку праводзіцца штогод. У мінулым годзе мы яго павялічылі: першапачаткова было 129 праектаў, стала 156, а ў канцы года мы яго пашырылі да 190. Цяпер ідзе чарговая карэкціроўка: у праграме з'явіцца яшчэ каля двух дзясяткаў праектаў».*

# Шляхам дабрыні



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Шматдзетная **сям'я Кацярыны і Віктара ЯМНЫХ** — пяцёра дзяцей і двое ўнукаў — сапраўдны прыклад захавання традыцыйных каштоўнасцяў, якія так неабходны ў сённяшні няпросты час. Кацярына і Віктар разам крочаць па жыцці з 1998 года. Увесь гэты час іх аб'ядноўвае жаданне рабіць дабро людзям. Кацярына — старшыня Заводскай раённай арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа і старшыня раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Заводскага раёна горада Мінска. Дапамога людзям для яе — справа жыцця. А штодзённы клопат для Віктара, старшыні таварыства ўласнікаў, — захаванне ўтульнасці і камфорту ў «падшэфным» доме.

Калі ж выпадае свабодная хвілінка, то дружная сям'я лічыць за найлепшае пагуляць разам у Лошыцкім парку, які асабліва прыгожы гэтымі веснавымі днямі.

Сацыяльны ракурс

# СЯМ'Я ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ — НАЙВЫШЭЙШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

**Спецыялісты расказалі, колькі сем'яў у краіне і на якую падтрымку яны могуць разлічваць**

**Сёння ў нашай краіне адзначаецца Дзень сям'і. Паводле даных Белстата, у краіне іх больш чым 2,6 мільёна: 78,2 % — у гарадах, а 21,8 % — у сельскай мясцовасці. У 2023 годзе ў Беларусі зарэгістравана 56 044 шлюбы, сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб у жанчын — 26 гадоў, у мужчын — 28. Пры гэтым летась зарэгістравана 444 шлюбы, у якіх жаніх і нявеста былі ва ўзросце 65 гадоў і старэйшымі. З іх 42 жанчыны і 60 мужчын стварылі сем'і ўпершыню. Большасць шлюбаў у нашай краіне (93 %) заключаецца паміж грамадзянамі Беларусі, у 6 % адным з бакоў з'яўляліся замежныя грамадзяне. Летась на падтрымку сем'яў з дзецьмі ў Беларусі накіравана тры мільёны 46 тысяч рублёў, што на 6,5 % больш, чым у 2022-м.**

### КОЖНАЕ ЧАЦВЁРТАЕ ДЗІЦЯ — СА ШМАТДЗЕТНАЙ СЯМ'І

Каля 44 % беларускіх сем'яў, а гэта 1 мільён 143 тысячы, маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. У асноўным беларускія сем'і маюць адно дзіця, такіх крыху больш чым 57 %. У кожнай трэцяй сям'і — два дзіцяці, а шматдзетных сем'яў звыш 9 %.

Як паведаміў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ**, міністэрства вядзе ўлік шматдзетных сем'яў.

— Мы канстатуем, што ёсць станоўчая дынаміка. Сёння ў краіне амаль 124 тысячы шматдзетных сем'яў, дзе выхоўваюцца 405 тысяч дзяцей. Кожнае чацвёртае дзіця ў краіне расце ў шматдзетнай сям'і. СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

# «Сёння сімволіка не толькі аб'ядноўвае, але і выступае крыніцай упэўненасці і ўнутранай сілы»




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«На ўрадлівай глебе любові да Радзімы гэта традыцыя прарасла ў нашы сэрцы, стаўшы сапраўды ўсенароднай», — заўважыў ён. Прэзідэнт адзначыў, што гэтак жа, як на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску, у вялікіх і малых гарадах краіны ў гэты дзень тысячы юнакоў і дзяўчат сёння прыносяць клятву вернасці дзяржаўным сімвалам. «Гэта знак глыбокай павагі да мінулага — духоўных і маральных каштоўнасцяў, завешчаных нам продкамі. Гэта шчырая падзяка за мірную і шчаслівую сучаснасць, якая забяспечана старэйшым пакаленнем сучаснікаў. Але самае галоўнае — гэта дэманстрацыя гатоўнасці ўзяць адказнасць за лёс сваёй краіны, бо вы, маладыя людзі, не проста ўступаеце ў дарослае жыццё. Абапіраючыся на ўсе здзяйсненні, як на моцныя плечы папярэднікаў, вы прымаеце эстафету ў справе захавання і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці. І абавязуецеся свята берагчы сімвалы незалежнай краіны», — падкрэсліў беларускі лідар.

## «РАЗАМ СКАЗАЛІ «НЕ» СІМВОЛІЦЫ, ЯКАЯ СТАЛА ДЛЯ НАС ЗНАКАМ БЯДЫ»

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што для яго гэты дзень напоўнены асаблівым сімвалізмам. Ён нагадаў, што амаль 30 гадоў таму, 14 мая 1995 года, прайшоў першы ў гісторыі суверэннай Беларусі рэферэндум. «Тады наш народ вызначыў свой шлях развіцця і асновы палітыкі беларускай дзяржавы. Гэта моцная прэзідэнцкая ўлада, стратэгічны саюз з Расіяй, роўны дзяржаўны статус беларускай і рускай моў, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Не паддаўшыся на пагрозы сучасных калабарантаў, а дакладней сказаць — здраднікаў ад палітыкі, захаваўшы вернасць сабе, сваім прынцыпам і ідэалам, сваёй гісторыі, мы разам абаранілі нашы сапраўдныя дзяржаўныя сімвалы. Разам сказалі «не» сімволіцы, якая стала для нас сапраўдным знакам бяды. Нашчадкі народа, які перажыў генацыд, уцалеў у канцлагерах і гета, які стаў на барацьбу з ворагам у шматлікіх партызанскіх атрадах і падполлі, інакш паступіць не маглі. Таму ў 1995-м пераважнай большасцю галасоў беларусы выказаліся за пераемнасць гераічнай сімволікі».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў пераходныя эпохі людзі часта адмаўляюцца ад сімвалаў, якія адлюстроўвалі ідэі і каштоўнасці ранейшага сацыяльна-палітычнага ладу. «Але гэта не наш шлях. Мы беражліва захоўваем сувязь пакаленняў, працягваем традыцыі нашых продкаў, ганарымся сваёй гісторыяй. У ёй няма ла гераічных старонак. Мы ніколі не вілялі, не здраджвалі той лініі, якую праводзім сёння. Мы і тады, і цяпер верныя традыцыям мінулага», — заявіў ён.

Паводле слоў Прэзідэнта, нашы людзі асабліва ганарацца тым, што дзяржаўныя сімвалы Беларусі ўвасабляюць беспрыкладную сілу духу і ўклад нашага народа ў Вялікую Перамогу над карычневай чумой. «Таксама ў іх працоўны подзвіг нашых бацькоў і дзядоў, якія нанова адбудавалі рэспубліку на прынцыпах сацыяльнай роўнасці і справядлівасці. Сучасныя дзяржаўныя флаг, герб і гімн — гэта ўжо сімвалы і нашых з вамі перамог: спартыўных, творчых, працоўных», — сказаў ён. Сцяг Беларусі ўзнімаўся навукоўцамі-палярнікамі ў Антарктыдзе, дэсантнікамі — на Паўночным полюсе, альпіністамі — на Эверэсце. Тройчы гэты сцяг пабываў у космасе. Спачатку з нашым земляком Алегам Навіцкім і зусім нядаўна з першай беларускай жанчынай-касманаўтам — Героем Беларусі Марынай Васілеўскай.

«Сёння сімволіка не толькі аб'ядноўвае, але і выступае крыніцай упэўненасці і ўнутранай сілы. Нашы герб, сцяг і гімн, як і ўся палітыка, натхнёныя ідэямі нацыянальнай годнасці і сапраўднага народаўладдзя», — канстатаваў беларускі лідар.

## «ЛЮДЗІ ГАНАРАЦЦА ТЫМ, ШТО ЯНЫ САПРАЎДНЫЯ БЕЛАРУСЫ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што дзяржаўныя сімвалы прысутнічаюць у паўсядзённым жыцці людзей, адыгрываючы вельмі важную ролю. Хутка ў школах пройдуць урачыстыя лінейкі. Пад гукі гімна дзясяткі тысяч выпускнікоў зробяць першыя крокі ў самастойнае жыццё. Завяршылася пасяўная. Наперадзе — уборачная кампанія. На палі выйдуць тысячы беларускіх камбайнаў. Пад родным сцягам аграрыі будуць здзяйсняць свае працоўныя подзвігі. Сотні пар рыхтуюцца ўступіць у законны шлюб. Гербавая пячатка замацуе іх клятвы ў вернасці. Усё часцей нашы герб і сцяг можна ўбачыць у вокнах жылых дамоў і аўтамабілях. А 3 ліпеня ў галоўнае для нашай краіны свята — Дзень Незалежнасці, у які мы адзначым і 80-годдзе вызвалення Беларусі, — мільёны суайчыннікаў напоўняць плошчы гарадоў і вёсак, каб праспяваць гімн разам.

«Людзі ганарацца тым, што яны сапраўдныя беларусы. Гэта і ёсць народнае адзінства. Адзінства, якое змацавана трывалай памяццю аб гераічным подзвігу нашых дзядоў і прадзедаў у Вялікай Айчыннай вайне, патрыятызмам, стваральнай працай і імкненнем да міру. Адзінства, якое сімвалізуюць Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Адзінства, якое мы абавязаны захаваць, каб зберагчы сваю краіну. Таму што час выбраў нас! Усіх са святам!» — сказаў Прэзідэнт.

На ўрачыстым мерапрыемстве ў сталіцы сёлета сабралася больш як 5,3 тысячы чалавек з усёй краіны. Ключавым элементам свята стала клятва вернасці дзяржаўным сімвалам, якую прынеслі маладыя беларусы. Момант і без таго ўрачысты, а дзякуючы вайскоўцам і артыстам і зусім незабыўны.

Пад гукі Дзяржаўнага гімна вайскоўцы роты ганаровай варты ўнеслі на плошчу Дзяржаўны сцяг (палотнішча памерам 10х5 метраў), які апынуўся ўнутры жывога контуру краіны — сярод артыстаў, якія сталі так, каб паўтарыць абрысы межаў Беларусі.

Клятву вернасці дзяржаўным сімвалам на плошчы Дзяржаўнага сцяга прамовілі сямёра хлопцаў і дзяўчат (прадстаўнікі ад кожнай з абласцей і Мінска). А Герой Беларусі Марына Васілеўская перадала Прэзідэнту той самы сцяг, які разгарнула на МКС падчас сваёй касмічнай экспедыцыі. Палотнішча зойме пачэснае месца ў Палацы Незалежнасці.

У гэты дзень аналагічныя рытуалы прынясення клятвы праходзяць ва ўсіх рэгіёнах краіны, тысячы прадстаўнікоў маладога пакалення клянуцца захоўваць вернасць дзяржаўным сімвалам, паабяцалі быць годнымі грамадзянамі, захоўваць мір і згоду на беларускай зямлі і, калі спатрэбіцца, абараняць яе гэтак жа годна і самаахвярна, як прадзеды ў гады Вялікай Айчыннай вайны, усё жыццё быць сапраўднымі патрыётамі і перадаць любоў да Радзімы сваім нашчадкам.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

## СІМВАЛІЧНА, ШТО НАШ ДЗЯРЖАЎНЫ СЦЯГ АБЛЯЦЕЎ ЗЯМЛЮ

У размове з журналістамі **Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ** расказала, што адчувала, калі бачыла з космасу сваю Радзіму: «У такія моманты разумееш, наколькі ты яе любіш і цэніш. Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і гімна сімвалізуе патрыятычныя, гістарычныя, культурныя каштоўнасці нашага народа. Сімвалічна, што наш Дзяржаўны сцяг абляцеў Зямлю 224 разы, і для мяне было вельмі пачэсна разгарнуць яго над Беларуссю. Сёння мяне перапаўняюць пачуцці радасці і гонару за нашу мірную, дружную, моцную краіну. Такія ж эмоцыі я адчувала там, на МКС, калі разгортвала наш сцяг. І мне вельмі прыемна прадставіць свету нашу чыстую, незалежную і моцную Беларусь».

Яшчэ адзін касманаўт, які разгортваў сцяг Беларусі на МКС, **Алег НАВІЦКІ**, расказаў, што касманаўты не з усіх краін гэта робяць падчас сваіх экспедыцый, але для яго разгарнуць беларускі сцяг у космасе — ужо традыцыя. «Гэта важная частка краіны, якая мне дарагая. Я — беларус, хоць цяпер знаходжуся ў Расіі. У Беларусі жывуць мая мама, мае родзічы, гэта мая зямля», — растлумачыў Алег Навіцкі. Па яго словах, свой сцяг падтрымлівае і грэе душу на борце МКС. Пасля вяртання на Зямлю адзін сцяг Алег Навіцкі перадаў у Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, другі — падарыў Прэзідэнту.

**Першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** адзначыў, што дзяржаўныя сімвалы аб'ядноўваюць моладзь. «Мы гэта бачым па шматлікіх акцыях, якія ініцыюююць і самі маладыя людзі. Яны носяць бутаньеркі, на многіх аўтамабілях можна ўбачыць беларускі сцяг. Мы ганарымся сваімі сімваламі. З тымі трапятаннем і адказнасцю, з якімі нашы маладыя людзі сёння ставяцца да дзяржаўных сімвалаў, я ўпэўнены ў іх светлай будучыні. Самае галоўнае, што гэта павага сёння назіраецца і ў школьных класах, і ў студэнцкіх аўдыторыях, і ў працоўных калектывах», — сказаў ён.

**Дэпутат палаты прадстаўнікоў Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ** падкрэсліў, што пад сённяшнімі дзяржаўнымі сімваламі зроблена вельмі шмат для дабрабыту беларускага народа. «Я ганаруся гэтым святам, ганаруся нашым сцягам, гербам, гімнам. Яны маюць вельмі глыбокія сэнсавыя нагрузкі. І за гэтай сімволікай стаіць вялікая гісторыя. Дастаткова ўспомніць, што на нашым сцягу знаходзіцца арнамент — для дзяржаўных сімвалаў гэта рэдкасць. А наш арнамент мае тысячагадовую гісторыю, ён адлюстроўвае мудрасць нашага народа. І гэтым нельга не ганарыцца», — падкрэсліў ён.

# СІМВАЛЫ РОСКВІТУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Сацдаследаванне: большасць беларусаў лічаць дзяржсімволіку галоўным нацыянальным сімвалам краіны

**Сацыялагічнае даследаванне праведзена Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў ліпені-жніўні 2023 года. Апытанне праводзілася ва ўсіх абласных гарадах і Мінску, асобных раённых гарадах і сельскіх населеных пунктах. Аб'ём выбарачнай сукупнасці — 1863 рэспандэнты.**

Згодна з вынікамі даследавання, больш за дзве трэці насельніцтва нашай краіны (68,3 % усіх апытаных) галоўным нацыянальным сімвалам Беларусі лічаць дзяржаўную сімволіку — Дзяржаўны герб, Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны гімн. Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікалай МЫСЛІВЕЦ**, дзяржаўныя сімвалы служаць сувязным звяном паміж дзяржавай і яе грамадзянамі, забяспечваюць пераемнасць пакаленняў і сацыяльную кансалідацыю ўсіх слаёў і груп грамадства, увасабляюць у сабе нацыянальную ідэю нашай дзяржавы. «Галоўныя сімвалы краіны аб'ядноўваюць нас у найважнейшыя і ўрачыстыя моманты — ад нацыянальных свят да спартыўных перамог, прыносячы кожнаму пачуццё гонару за тое, што мы — часціца нашай роднай Беларусі!» — падкрэсліў ён.

Па словах дырэктара Інстытута сацыялогіі Беларусі, адной з найважнейшых умоў паспяховага вырашэння значных для Рэспублікі Беларусь задач з'яўляецца кансалідацыя грамадства. «На ўсіх этапах сваёй гісторыі беларускі народ гераічна бараніў родную зямлю, беражліва захоўваў сваю нацыянальную культуру і ўласны ўклад жыцця, думаў пра будучыню, — канстатаваў ён. — Актуальнасць умацавання адзінства нашага грамадства яшчэ больш узрастае ў сучасных умовах. Сацыяльная кансалідацыя — адзін з найважнейшых фактараў забеспячэння нацыянальнай бяспекі беларускай дзяржавы і грамадства. Кансалідацыі грамадства служаць шматлікія агульнапрынятыя сімвалы: у адзенні і ўпрыгожваннях, жыллёвых пабудовах і паўсядзённым жыцці. Беларусы шануюць і беражліва захоўваюць традыцыйныя народныя сімвалы, для ўсіх нас значныя і цікавыя аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, помнікі Вялікай Айчыннай вайны. Сучасным беларусам дарагія беларуская мова і літаратура, рэлігійныя святыні».

Мікалай Мыслівец падкрэсліў, што адным з найважнейшых атрыбутаў Рэспублікі Беларусь як суверэннай і незалежнай дзяржавы з'яўляюцца дзяржаўныя сімвалы: Дзяржаўны герб, Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны гімн. «З дапамогай простых і зразумелых сродкаў яны адлюстроўваюць гістарычныя і культурныя традыцыі беларускага народа, ідэнтычнасць і культурны код нацыі, менталітэт і духоўны патэнцыял грамадства», — акцэнтаваў увагу навуковец.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі з раптоўнай смерцю Уладзіміра Віктаравіча КАЛАЧА, памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектара па Мінскай вобласці, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# СЯМ'Я ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ — НАЙВЫШЭЙШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сацыяльная абарона сем'яў з дзецьмі забяспечваецца па розных кірунках: выплата дзяржаўных дапамог, праграма сямейнага капіталу, гарантыі ў сферы працы, пенсіённага забеспячэння, жыллёвыя крэдыты. Паводле слоў Валерыя Кавалькова, расходы дзяржбюджэту на меры сацыяльнай абароны сем'яў з дзецьмі штогод складаюць больш чым 3 % ВУП. Сёлета на сістэму дзяржаўных дапамог будзе накіравана 3,4 мільярда рублёў, з іх 1,8 мільярда — на выплату дапамог па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў.

Сёння дзяржаўныя дапамогі атрымліваюць 380 тысяч дзяцей, з іх ва ўзросце да трох гадоў — 207 тысяч. Памеры дапамог, дарэчы, былі павялічаны з 1 мая бягучага года з улікам бюджэту пражытачнага мінімуму. Пры нараджэнні першага дзіцяці сям'я атрымлівае 4200 рублёў. Калі нараджаюцца другое і наступныя дзеці, то аднаразовая выплата складае амаль шэсць тысяч рублёў.

Дапамогі па доглядзе за дзіцем перавышаюць мінімальную заработную плату ў краіне. Калі ў сям'і выхоўваецца першае дзіця, такая дапамога складае 725 рублёў, калі другое і наступныя — 825 рублёў. Пры гэтым выплачваюцца і дапамогі на дзяцей, старэйшых за тры гады.

Калі сям'я мае патрэбу, ёй аказваецца дадатковая матэрыяльная падтрымка — штомесячная ці аднаразовая сацыяльная дапамога. Летась яе атрымалі каля 55 тысяч чалавек. Сем'ям, у якіх выхоўваецца двойня або трайня, даецца бясплатнае харчаванне для дзяцей да таго часу, калі ім споўніцца два гады. Летась такую дапамогу атрымалі больш як 10 тысяч дзяцей, а сярэдні кошт набору прадуктаў складае 220 рублёў. Гэта дадатковая падтрымка да тых дапамог, якія атрымлівае сям'я. На аказанне адраснай дапамогі сёлета запланавана вылучыць 140 мільёнаў рублёў.

## ПРАЦОЎНЫЯ, ЖЫЛЛЁВЫЯ І ПЕНСІЁННЫЯ ГАРАНТЫІ

Валерый Кавалькоў паведаміў, што паспяхова развіваецца праграма сямейнага капіталу, які назначаецца і выплачваецца пры нараджэнні трэцяга і наступнага дзяцей. Са студзеня бягучага года сума была праіндэксавана і складае 31 480 рублёў. За ўвесь перыяд дзеяння праграмы — са студзеня 2015 года — было адкрыта 137 тысяч укладаў.

З 2020 года шматдзетныя сем'і могуць выкарыстоўваць сродкі сямейнага капіталу датэрмінова на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне платных медыцынскіх паслуг ці паслуг адукацыі. На 1 мая 2024 года прынята больш чым 82 тысячы рашэнняў аб датэрміновым выкарыстанні сродкаў сямейнага капіталу, пераважная большасць (81 %) была накіравана на паляпшэнне жыллёвых умоў, 11 % — на атрыманне платных медыцынскіх паслуг, 8 % — на атрыманне адукацыі. Пры гэтым атрымаць адукацыю на платнай аснове могуць не толькі дзеці ў шматдзетных сем'ях, але і іх бацькі.

Развіваецца сістэма сацыяльнага абслугоўвання і падтрымкі сем'яў з дзецьмі. Гэта, у прыватнасці, паслугі нянькі, якія даюцца, калі ў сям'і выхоўваюцца двайняты або трайняты, дзіця-інвалід ці абодва бацькі з'яўляюцца інвалідамі. Даецца таксама паслуга патранату для пераадолення цяжкіх жыццёвых сітуацый. За мінулы год яе атрымалі больш як чатыры тысячы сем'яў. Ёсць паслуга сацыяльнай перадышкі для сем'яў з дзіцем-інвалідам. Яго можна змясціць у дом-інтэрнат на перыяд да 56 дзён у год з кругласутачным доглядам, пры гэтым усе сацыяльныя выплаты захоўваюцца.

Распрацаваны механізм падтрымкі і праз працоўныя адносіны. У Працоўны кодэкс унеслі змены, і сёння бацькам у шматдзетных сем'ях, якім раней быў дадзены адзін свабодны дзень у тыдзень, можна скараціць на гадзіну працягласць рабочага дня. Прапісана магчымасць дыстанцыйнай работы.

Па-ранейшаму сем'ям аказваецца значная падтрымка ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Маладой сям'і з двума дзецьмі льготны крэдыт даецца пад 5 % гадавых на 20 гадоў, шматдзетнай сям'і — пад 1 % гадавых на 40 гадоў. Пры гэтым для сем'яў з трыма дзецьмі дзяржава пагашае 75 % ад сумы запазычанасці па такіх крэдытах. Калі ў сям'і чацвёра дзяцей, нават ільготны крэдыт дзяржава пагашае цалкам. У 2023 годзе жыллёвыя ўмовы палепшыла 6,8 тысячы маладых сем'яў і амаль 10 тысяч шматдзетных сем'яў.

Шэраг гарантый прадугледжаны ў галіне пенсіённага забеспячэння. Час догляду за дзіцем залічваецца ў працоўны стаж, бо працягласць працы аказвае ўплыў на памер пенсіі. Акрамя таго, для маці, якія нарадзілі чацвярых дзяцей, працягласць страхавога стажу знізана да дзесяці гадоў.

Маці, якія нарадзілі пяцярых і болей дзяцей, дадзена права датэрміновага выхаду на пенсію — на пяць гадоў раней. Маці, якія нарадзілі і выхавалі дзевяцярых і больш дзяцей, таксама ўдастоеныя ўзнагароды СССР ці Беларусі за мацярынства, даецца права на пенсію за асаблівыя заслугі. Цяпер такую пенсію атрымліваюць 447 шматдзетных маці.

— Мы разумеем, што сям'я для нашых грамадзян з'яўляецца найвышэйшай каштоўнасцю. Гэта пацвярджаюць сацыялагічныя даследаванні. У красавіку 2023 года Інстытут сацыялогіі НАН правёў сацыялагічнае апытанне аб жыццёвых прыярытэтах. Сярод галоўных — здароўе (85 %), сям'я (73 %), дзеці (68 %). Пры гэтым шлюб апытанымі разглядаецца як абавязковая прыкмета сямейнага жыцця, і ён асабліва важны пры прыняцці рашэння аб нараджэнні дзяцей. Каля паловы апытаных лічаць для сябе аптымальным мець сям'ю з двума дзецьмі, — рэзюмаваў Валерый Кавалькоў.

## КОЛЬКАСЦЬ ІНТЭРНАТАЎ ЗМЕНШЫЛАСЯ ЎТРАЯ

Важнымі кірункамі сацыяльнай палітыкі дзяржавы з'яўляюцца падтрымка дзяцей-сірот і развіццё сямейных формаў уладкавання, яны забяспечваюць найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця дзяцей.

— Летась прыняты змены ў пастанову ўрада, якая ўстанаўлівае аднаразовыя грашовыя выплаты на першапачатковае набыццё інвентару і абсталявання пры прыёме на выхаванне дзяцей ад нуля да трох гадоў у прыёмныя, апякунскія сем'і, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Павялічаны памеры дапамог прыёмным бацькам, бацькам-выхавацелям у сувязі з тым, што абнавіўся пералік адзення, абутку і мяккага інвентару, павялічаны памеры грашовых выплат на ўтрыманне такіх дзяцей, — расказала **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА**.

У Беларусі паступова скарачаецца сетка дзіцячых інтэрнатных устаноў. З 2015 года іх колькасць зменшылася больш чым у тры разы — з 36 у 2015 годзе да 10 у 2023-м. У мінулым годзе была ліквідавана Капыльская дапаможная школа-інтэрнат, дзеці выхоўваюцца ў сем'ях.

Скарацілася колькасць дзяцей, ад выхавання якіх адмаўляюцца бацькі, у многім дзякуючы і той падтрымцы, якую аказвае дзяржава сем'ям, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды. Больш за 88 % дзяцей, якія штогод застаюцца без апекі бацькоў, уладкоўваецца на выхаванне ў сем'і. Гэтаму садзейнічае развіццё сеткі замяшчальных і апякунскіх сем'яў, прыёмных дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

— За апошнія гады сфарміравана практыка ўладкавання ў сем'і не толькі дзяцей, якія развіваюцца нармальна, але і дзяцей-інвалідаў. Летась 29 такіх дзяцей з інтэрната былі перададзены ў сем'і, якія падрыхтавалі ўмовы і займаюцца іх выхаваннем, у тым ліку шэсць такіх дзяцей былі ўсыноўлены, — паведаміла Алена Сімакова.

Яна праінфармавала, што летась крыху больш чым дзве тысячы дзяцей засталіся без апекі бацькоў. З іх толькі 282 дзіцяці з'яўляюцца біялагічнымі сіротамі, іх бацькі памерлі ці прызнаны адсутнымі без вестак. Звыш 80 % — дзеці, бацькі якіх жывыя, але не займаюцца іх выхаваннем у сувязі з тым, што пазбаўлены бацькоўскіх праваў. Большасць такіх дзяцей уладкаваныя на сямейныя формы выхавання.

— Ёсць станоўчая дынаміка ў тым, што штогод бацькі мяняюць сваё адносіны да выхавання дзяцей і ў судовым парадку аднаўляюцца ў бацькоўскіх правах. Летась было 77 такіх бацькоў, 104 дзіцяці вярнуліся ў родныя сем'і. Чацвёра бацькоў звярнуліся ў суд, было адменена рашэнне суда аб адабранні дзяцей без пазбаўлення бацькоўскіх праваў, — адзначыла Алена Сімакова.

Цяпер у краіне каля 15 тысяч дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Пераважна яны выхоўваюцца ў замяшчальных сем'ях з іх (12 103 дзіцяці). Большасць з іх (7424) — у апякунскіх, крыху больш як дзве тысячы — у прыёмных, 1840 дзяцей — у дзіцячых дамах сямейнага тыпу. Больш чым пяць тысяч дзяцей жывуць у сем'ях усынавіцеляў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Анонс

# У МАСТАХ ПРОЙДЗЕ ФЕСТЫВАЛЬ ПАЭЗІІ

**«Масты сугучнасці» — такую назву носіць Рэспубліканскі фестываль паэзіі, які адбудзецца ў Мастах, на Гродзеншчыне, 17 мая. Арганізатары — Саюз пісьменнікаў Беларусі, Мастоўскі раённы выканаўчы камітэт, Мастоўская раённая бібліятэка і Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей.**

Падзею анансіруе **старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі вядомая ў нашай краіне пісьменніца Людміла КЕБІЧ**:

— Мы рады, што атрымалася такое вось супольніцтва мастоўскіх улад, мастоўскіх бібліятэкараў і літаратараў Гродзеншчыны, усёй краіны. Сёння часта даводзіцца чуць, што паэзіі час мінуў, яна не карыстаецца той грамадскай вагой, як некалі. Маўляў, стадыёны ўжо не збіраюцца, каб паслухаць палымянае выступленне паэта... Не буду спрачацца. За мастакоў слова павінны спрачацца іх творы. І вось цяпер праява такой увагі, згода правесці выключна паэтычны фестываль, прычым у раённым цэнтры, не так блізка ад Мінска, з удзелам прадстаўнікоў усіх абласцей краіны.

Дарэчы, пляцоўкамі правядзення свята паэзіі будуць розныя адрасы — і ў Мастах, і ў Гудзевічах. А дакладней — Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, СШ № 2 г. Масты імя Героя Савецкага Саюза В. П. Жукава, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, Гудзевіцкі цэнтр вольнага часу і культуры, Гудзевіцкая сельская бібліятэка. У Мастоўскай раённай бібліятэцы будзе разгорнута кніжная выстаўка «Паэзія. Творцы. Час». На розных пляцоўках пройдуць творчыя сустрэчы паэтаў з чытачамі — «Паэзія свет надзяляе душой», «Верш — гэта мост ад сэрца людскога да мары», «Зорны вяночак беларускай паэзіі».

У Мастоўскай раённай бібліятэцы пройдзе круглы стол «Паэзія на ўсе часы: творы і творцы». З дакладам «Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці сучасных паэтаў Гродзеншчыны» выступіць старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Людміла Кебіч. Паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык выступіць з аглядам зборніка лірыкі «Спрадвечны бераг», куды ўвайшлі вершы Міхася Васілька, Юркі Голуба, Мар'яна Дуксы. Кандыдат філалагічных навук Аліна Сабуць пазнаёміць прысутных з тэмай «Своё як фактар нацыянальнай самасці ў творчасці сучасных паэтаў Гродзеншчыны». Удзел у круглым стале прымуць старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ Таццяна Дземідовіч, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення СПБ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Гаўрыловіч, паэтэса Валянціна Драбышэўская, старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення СПБ паэт Алесь Казека, кандыдат філалагічных навук, літаратурны крытык Алена Кісель і іншыя пісьменнікі і літаратуразнаўцы.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# АСЦЯРОЖНА, ВАДА!

## Пра што варта ведаць дарослым і аб чым папярэдзіць дзяцей напярэдадні купальнага сезона



**Нягледзячы на тое што ён яшчэ толькі пачаўся, у вады — ужо першыя ахвяры. Ранняя вясна зрабіла сваю справу. 26 сакавіка ратавальнікам паступіў сігнал аб знойдзеных асабістых рэчах падлетка 2009 года нараджэння на беразе штучнага вадаёма каля вёскі Новы Двор Мінскага раёна. Супрацоўнікі МНС, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, дасталі з вады цела падлетка...**

Як паведамілі пасля ў Таварыстве ратавання на водах, дзевяцікласнік паехаў на веласіпедзе з сябрам пакупацца, але хлопцы не знайшлі прыдатнага месца для заходу ў ваду і вырашылі вярнуцца дадому. Па дарозе падлеткі пасварыліся і раз'ехаліся. Крыху пазней маці аднаго са школьнікаў пачала турбавацца, бо ён не вярнуўся дадому. Яна тэлефанавала сыну, але ёй ніхто не адказаў. Тады жанчына адправіла старэйшага сына і яго сябра на пошукі. Хлопцы знайшлі веласіпед дзевяцікласніка і яго асабістыя рэчы каля дарогі насупраць тэхнічнага вадаёма, у якім і патануў падлетак.

### БУДЗЬЦЕ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ

Яшчэ адзін трагічны выпадак здарыўся ў Слуцкім раёне. 2 мая ў вёсцы Казловічы бацькі 14-гадовага хлопца заўважылі адсутнасць падлетка і сталі яго шукаць. Пошукавыя мерапрыемствы, у якіх сумесна з ратавальнікамі ўдзельнічалі праваахоўныя органы, працягваліся амаль шэсць гадзін. На беразе вадаёма, які знаходзіцца паблізу вёскі, былі знойдзены адзенне падлетка і яго веласіпед. Супрацоўнікі дасталі цела непаўналетняга з вады без прыкмет жыцця. Вадаём з'яўляецца тэхнічным, не прызначаным для купання.

Як звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ**, менавіта падлеткі часам паводзяць сябе занадта бестурботна, самаўпэўнена, бегаюць і пясцяцца каля вады, не адчуваючы ніякай небяспекі. «Бацькі павінны разумець, што, колькі б ні было гадоў дзіцяці, яно не павінна знаходзіцца без нагляду дарослых, — падкрэслівае яна. — І менавіта бацькі абавязаны пагаварыць з дзецьмі аб усім, што можа адбыцца; папярэдзіць аб небяспецы і растлумачыць наступствы».

**Па-першае**, для купання варта выбіраць толькі спецыяльна абсталяваныя месцы, бо там дзяжураць ратавальнікі. **Па-другое**, ні ў якім разе не адпускайце дзяцей на вадаём адных, маленькіх дзяцей трымайце на адлегласці выцягнутай рукі. **Па-трэцяе**, растлумачце падлеткам, чаму небяспечна ныраць у ваду з вышыні, у невядомых месцах: можна стукнуцца галавой аб грунт, зламаць шыйныя пазванкі, страціць прытомнасць і загінуць. Не менш небяспечна таксама ныраць у ваду з мастоў, плытоў, прыстаняў, дамбаў, іншых збудаванняў. Пад вадой могуць быць, напрыклад, камяні або іншыя небяспечныя прадметы. І самае галоўнае, дарослым важна не забываць — дзеці капіруюць іх паводзіны. Таму выконвайце правілы бяспекі самі.



Адкрыццё купальнага сезона магло скончыцца трагічным выпадкам і ў Лепелі. Вечарам 4 мая ратавальнікі выехалі да ракі Ула: паступіла паведамленне аб тым, што тоне дзіця. Калі супрацоўнікі МНС прыехалі да месца здарэння, падлетак знаходзіўся за дзесяць метраў ад супрацьлеглага берага ракі і трымаўся за галіны паваленага дрэва. Ратавальнікі Іван Конкін і Віталь Жыветаў пры дапамозе ратавальнай дошкі даплылі да хлопчыка, даставілі яго на бераг і перадалі супрацоўнікам хуткай медыцынскай дапамогі.

Як потым высветлілася, кампанія хлопчыкаў і дзяўчынак вырашыла адкрыць купальны сезон. Раптам падлетак 2011 года нараджэння пачаў тануць. Адзін з яго таварышаў кінуўся на дапамогу, але падплысці да сябра яму замінала плынь. У гэты час дзіця, якое танула, аднесла да супрацьлеглага берага, дзе яно і знаходзілася да прыезду ратавальнікаў. На шчасце, здароўю пацярпелага нічога не пагражала.

Дарэчы, небяспеку для дзяцей, асабліва малых, уяўляюць не толькі буйныя вадаёмы, але і дэкаратыўныя сажалкі, басейны і нават ёмістасці з вадой. Толькі бацькі, якія ведаюць пра магчымыя небяспекі і ўспрымаюць іх сур'ёзна (якімі рэдкімі і неверагоднымі яны не здаваліся б), змогуць зберагчы сваё дзіця ад бяды.

Знаходзячыся з дзецьмі каля вады, пільнасць нельга губляць ні на хвіліну. Аб гэтым сведчыць трагічны выпадак, які здарыўся днём 25 чэрвеня мінулага года на тэрыторыі прыватнага дома ў Мінскім раёне. Як высветлілася, увесь дзень шматдзетная сям'я займалася будоўляй, у пэўны момант дзіця знікла з поля зроку бацькоў. Заўважыўшы адсутнасць дзяўчынкі, бацька з маці сталі яе шукаць. Паўтарагадовае дзіця знайшлі ў каркасным басейне і ўжо без прыкмет жыцця. Басейн быў абсталяваны лесвіцай, па якой малое змагло самастойна спусціцца.

### УВАЖЛІВАСЦЬ І ВЫКАНАННЕ ПРАВІЛ

Што датычыцца дарослых, якія становяцца ахвярамі вады, то прычыны трагедый, як правіла, — бестурботнасць грамадзян і парушэнне правіл паводзін на вадзе. У большасці выпадкаў надзвычайныя здарэнні адбываюцца падчас распівання спіртных напояў, пры заплыве ў нецвярозым стане, купанні ў забароненых месцах, дзе няма ратавальных станцый. Ужыванне алкаголю і адпачынак каля вады часта становяцца прычынай гібелі людзей. Купацца ў вадаёме ў стане алкагольнага ап'янення — небяспечна для жыцця.

— Тонуць у асноўным працаздольныя людзі, якія, як правіла, не ўжываюць спіртныя напоі, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ**. — Адпачываючы на пляжы, крыху выпіваюць — адпаведна, узнікаюць пэўныя праблемы. Гэта могуць быць як фізіялагічныя працэсы (сэрца, сутаргі), так і няўважлівасць, калі чалавек заплыў далёка, не разлічыў сілы і не здолеў вярнуцца назад. Такім чынам, людзі становяцца ахвярай у першую чаргу ўласнай бяспечнасці.

Ратавальнікі рэкамендуюць ацэньваць свае сілы падчас плавання, не плыць на спрэчку. Нярэдка нават тыя, хто ўмее добра плаваць, заплываюць на глыбіню, а вярнуцца на бераг ужо не хапае сіл.

Не варта забываць аб бяспецы, калі вы адплываеце на лодцы, катэры, гідрацыкле: самае галоўнае правіла — надзець выратавальны камізэльку. Нельга перавышаць устаноўленую колькасць людзей на борце, кіраваць плаўсродкамі ў стане алкагольнага ап'янення, сядзець на бартах, пераходзіць з месца на месца і перасаджвацца на іншыя катэры, лодкі; выходзіць на ваду на плаўсродках, зусім для гэтага не прыстасаваных.

Вельмі часта пры адпачынку на вадзе людзі выкарыстоўваюць розныя надзіманыя прадметы. Плаваць на іх небяспечна, а для чалавека, які не ўмее трымацца на вадзе, — увогуле трагічна. Надзіманыя камеры, матрацы вельмі лёгкія, нават слабага ветру і плыні дастаткова, каб аднесці іх на вялікія адлегласці. Варта адцягнуць увагу на некалькі хвілін — і бераг аказваецца па-за межамі дасягальнасці. Матрац можа захліснуць хваляй, ён можа выслізнуць з-пад плыўца і накрыць яго з галавой.

Па словах Яўгена Бараноўскага, неабходна выбіраць спецыяльна абсталяваныя месцы для купання — тыя, дзе ёсць уся неабходная інфраструктура; дзе дзяжураць ратавальнікі Таварыства ратавання на водах. «Больш за тое, у купальным сезоне мы плануем узмацніць свае сілы: на пляжах дадаткова будуць дзяжурыць нештатныя плыўцы-ратавальнікі з ліку супрацоўнікаў МНС, якія таксама будуць знаходзіцца ў зонах адпачынку для таго, каб своечасова прыйсці на дапамогу тым, хто трапіў у бяду, — канстатаваў ён. — Непасрэдна каля прыбярэжнай тэрыторыі будуць шырока праводзіцца прафілактычныя акцыі. Станем хадзіць не толькі па месцах, дзе дазволена купацца, а і там, дзе гэта забаронена. Сёння мясцовымі органамі ўлады робіцца важная работа для таго, каб павялічвалася колькасць дазволеных пляжаў. Думаю, у пачатку чэрвеня мы арганізуем інтэрактыўную карту: усім пакажам і раскажам, дзе купацца можна і бяспечна, дзе рызыка знізіна, дзе ёсць уся неабходная інфраструктура для добрага і бяспечнага адпачынку».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ СТАЛІ ВІДАВОЧЦАМ ТАГО, ШТО НЕХТА ТОНЕ:

- паклічце на дапамогу іншых людзей або ратавальнікаў Таварыства ратавання на водах, калі тыя ёсць побач;
- патэлефануйце па тэлефоне МНС 112 і выклічце хуткую дапамогу па тэлефоне 103;
- кіньце таму, хто тоне, ратавальны круг або доўгую вяроўку з вузлом на канцы (калі яны ёсць);
- калі ёсць лодка, падплывіце да чалавека і паспрабуйце дапамагчы;
- калі вы добра плаваеце і ўпэўнены ў сваіх сілах, паспрабуйце дабрацца да чалавека самастойна: абхапіце яго ззаду за плечы, пазбягаючы спроб ухапіцца за вас, і плывіце з ім назад;
- калі ж тапелец без прытомнасці, цягніце яго да берага, узяўшы рукой пад падбародак такім чынам, каб яго твар увесь час знаходзіўся над паверхняй вады, а пры першай магчымасці прыступіце да аказання першай медыцынскай дапамогі.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Хасэ Раулю Муліна ўручылі пасведчанне прэзідэнта Панамы



Хасэ Раулю Муліна, які атрымаў перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у Панаме, што адбыліся 5 мая, уручылі пасведчанне кіраўніка дзяржавы. Аб гэтым паведаміла газета La Prensa. Паводле яе інфармацыі, Муліна набраў 34,23 працэнта галасоў. «Выснова гэтага 5 мая ў тым, што палітычнае абнаўленне краіны пачалося», — заявіў абраны прэзідэнт падчас урачыстай цырымоніі ўручэння. Ён паведаміў, што ў найбліжэйшы час мае намер скончыць фарміраванне спіса асоб, якія ўвойдуць у склад новага ўрада. Муліна валодае багатым кіраўнічым досведам. Ён узначальваў міністэрствы замежных спраў, грамадскай бяспекі, а таксама юстыцыі. Падчас перадвыбарнай кампаніі палітык абяцаў вырашыць праблемы беспрацоўя і злачыннасці, разабрацца з сітуацыяй з водазабеспячэннем, палепшыць сістэму грамадскага транспарту, пашырыўшы сетку сталічнага метрапалітэна.

### У Германіі пачасціліся выпадкі нападу на палітыкаў

Днямі невядомы мужчына напаў на экс-мэра Берліна і былога федэральнага міністра Францыску Гіфі. На мерапрыемстве ў берлінскай бібліятэцы невядомы мужчына падышоў да яе ззаду і ўдарыў яе сумкай, у якой знаходзілася нешта цвёрдае і цяжкае, паведаміла «Бі-бі-сі». Раней адзін з вядучых кандыдатаў на маючых адбыцца 9 чэрвеня выбарах у Еўрапарламент быў сур'ёзна паранены падчас расклейкі плакатаў у Дрэздэне. Як урадавыя, так і апазіцыйныя партыі заяўляюць, што іх члены і прыхільнікі ў апошнія месяцы сутыкнуліся з хваляй фізічных нападаў і абраз і заклікаюць паліцыю ўзмацніць абарону палітыкаў і перадвыбарных мітынгаў. Федэральны міністр унутраных спраў Германіі Нэнсі Фезер пасля сустрэчы з міністрамі ўнутраных спраў 16 зямель краіны заявіла аб магчымым узмацненні жорсткасці крымінальнага заканадаўства, каб «больш строга караць антыдэмакратычныя дзеянні». Паводле звестак паліцыі, летась у краіне было здзейснена 2790 злачынстваў супраць палітыкаў, што на 1806 больш, чым у папярэднім годзе.




### Тэмпература павысіцца мінімум на 2,5 градуса



Вядучыя кліматолагі чакаюць, што ў гэтым стагоддзі ў параўнанні з даіндустрыяльным узроўнем тэмпература ў свеце ўзрасце як мінімум на 2,5 градуса, выклікаўшы катастрафічныя наступствы для планеты і чалавецтва. Такая выснова, паводле газеты The Guardian, зроблена пасля апытання экспертаў. Амаль 80 працэнтаў спецыялістаў выказалі адпаведнае меркаванне. Каля паловы рэспандэнтаў чакаюць, што тэмпература ўзрасце як мінімум на тры градусы. Эксперты адзначылі, што адчуваюць безвыходнасць і страх у сувязі з «няздольнасцю ўлад распачаць якія-небудзь дзеянні, нягледзячы на тое што ў іх ёсць відавочныя навуковыя доказы» будучай кліматычнай катастрофы. Амаль дзве трэці рэспандэнтаў указалі на адсутнасць палітычнага імкнення дзяржаў вырашыць праблему павышэння тэмпературы.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# Пагроза на прысядзібным участку

## Якое небяспечнае захворванне разносяць мышы?

**Прыйшла вясна, і дачны сезон адкрыты. Завяршаецца прыборка ў доме і на ўчастку. Аднак мала хто ведае, што тут нас можа падсцерагаць небяспечнае інфекцыйнае захворванне, якое перастала быць для Беларусі экзатычным. Гэта гемарагічная ліхаманка з ныркавым сіндромам (ГЛНС). Раней вірусныя гемарагічныя ліхаманкі былі больш распаўсюджаны ў краінах трапічнага і субтрапічнага клімату, аднак анамаліі надвор'я, у тым ліку глабальнае пацяпленне, паспрыялі актыўнаму пашырэнню арэала інфекцыі. Дзе існуе небяспека заразіцца і як ад яе засцерагчыся, расказала ўрач-інфекцыяніст 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска Дар'я ПЕТРАЧУК.**

***— Дар'я Ігараўна, раскажыце, як можна заразіцца гэтай хваробай.***

— Гемарагічная ліхаманка з ныркавым сіндромам — тыповая заанозная інфекцыя, гэта значыць заразіцца ёй можна толькі ад пазваночных жывёл. А вось рэзервуарам з'яўляюцца мышападобныя грызуны: палявыя і лясныя мышы, пацукі, палёўкі і інш. Перадача інфекцыі ад грызуна да грызуна ажыццяўляецца кляшчамі і блыхамі. Ёсць некалькі шляхоў перадачы ўзбуджальніка ад жывёл да чалавека.

Першы — паветрана-пылавы: пры ўдыханні віруса з высахлымі экскрэментамі, у прыватнасці мачой інфікаваных грызуноў. Для заражэння, дарэчы, дастаткова пяціхвіліннага знаходжання ў памяшканні, дзе знаходзіліся інфікаваныя жывёлы.

Яшчэ адзін шлях — кантактна-бытавы: пры дакрананні да забруджаных узбуджальнікам аб'ектаў навакольнага асяроддзя (пыл, глеба, збожжа, салома, галлё, сена і інш.) і пашкоджаных скурных або слізістых покрываў чалавека.

Магчымы аліментарны шлях — пры ўжыванні інфікаваных выдзяленнямі грызуноў харчовых прадуктаў, якія не прайшлі тэрмічную апрацоўку, напрыклад капусты, яблыкаў ці морквы. Таксама можна заразіцца пры ўжыванні забруджанай вады.

***— Што адбываецца з чалавекам пасля заражэння?***

— Інкубацыйны перыяд (час ад моманту заражэння да праяўлення сімптомаў хваробы) можа складаць ад аднаго тыдня да паўтара месяца, у сярэднім 21 дзень. Пачынаецца хвароба з агульнай інфекцыйнай інтаксікацыі. Паднімаецца тэмпература да 38-40 °C. Ліхаманкавы перыяд доўжыцца ад аднаго да трох дзён.

Таксама з'яўляюцца выяўленыя дрыжыкі, моцны галаўны боль, болевы сіндром у мышцах, каленных суставах, паясніцы. Магчымыя млоснасць, ваніты, млявасць. Акрамя таго, могуць непакоіць «туман перад вачыма», мільганне мушак, зніжэнне вастрыні зроку, бачанне прадметаў у чырвоным колеры. Часта назіраюцца ацёчнасць і пачырваненне твару, шыі, верхніх аддзелаў грудзей (сімптом капюшона).

Узбуджальнік валодае выяўленай здольнасцю паражаць сценкі сасудаў, што абумоўлівае ачаговыя кровазліцці ва ўнутраных органах з далучэннем гемарагічнага сіндрому. Клінічна ён праяўляецца петэхіяльным сыпам (гэта дробныя кровазліцці) у вобласці тулава, унутранай паверхні плячэй, кровазліццямі ў склеру, кан'юктыву вачэй, сінякамі ў месцах ін'екцый. Яшчэ магчымыя страўнікава-кішачныя, матачныя, насавыя крывацёкі, гематурыя (кроў у мачы).

Аднак галоўны арганмэта віруса — ныркі, таму ў востры перыяд можа паўстаць рэзкае зніжэнне дыўрэзу аж да анурыі, калі хворы практычна не мочыцца.

Калі пацыент перажыў перыяд разгару хваробы, то з 9-13-га дня ад пачатку захворвання ў выніку фарміравання імунітэту паступова пачынаецца выздараўленне.



***— Улічваючы, што захворванне такое цяжкае, як яго папярэдзіць?***

— Пры прыборцы дачных, дапаможных памяшканняў, гаражоў, скляпоў неабходна надзяваць маску і гумовыя пальчаткі. Прыборка павінна праходзіць толькі вільготным спосабам з ужываннем сродкаў дэзінфекцыі з наступным праветрываннем памяшкання.

Харчовыя прадукты варта захоўваць у металічнай тары, якая шчыльна закрываецца. У час першага наведвання дачы абед лепш узяць з дому. Ваду неабходна ўжываць прывезеную з сабой, кіпячоную або бутыляваную.

Для надзейнага папярэджання заражэння ГЛНС неабходна праводзіць знішчэнне грызуноў усімі даступнымі сродкамі на тэрыторыі дач, садоў, прыватных пабудоў не радзей двух разоў на год, асабліва ў перыяды масавай міграцыі грызуноў у жылыя памяшканні, а гэта красавік-май і верасень-кастрычнік.

Таксама важна выключыць магчымасць пранікнення грызуноў у жылыя памяшканні і гаспадарчыя пабудовы. Для гэтага варта залатаць вентыляцыйныя адтуліны металічнай сеткай і зацэментаваць шчыліны і адтуліны. Старайцеся не захламляць жыллё і дапаможныя памяшканні, дваровыя ўчасткі, своечасова вывозьце бытавое смецце.

У летні перыяд пры наведванні лесу посуд і ежу нельга раскладваць на траве, пнях. Для начлегу варта выбіраць сухія, не зарослыя хмызняком участкі лесу, дзе няма грызуноў. Пазбягаць начлегу ў стагах сена і саломы.

Пры перавозцы і складзіраванні сена, саломы, нарыхтоўцы дроў, пераборцы агародніны абавязкова выкарыстоўвайце маску і гумовыя пальчаткі. Пасля заканчэння работ старанна вымыйце рукі з мылам.

Улічваючы сур'ёзнасць і цяжар захворвання, лячэнне хворых ажыццяўляецца толькі ў стацыянары. Таму пры з'яўленні першых прыкмет хваробы неабходна неадкладна звярнуцца да ўрача.

Карысна ведаць

# Не чытаць лежачы і ў транспарце

## Што больш за ўсё пагаршае зрок?

**Паўсюднае выкарыстанне гаджэтаў вылілася ў праблемы са зрокам як у дарослых, так і ў дзяцей — блізарукасць маюць 10 % вучняў малодшых класаў, сярод старшакласнікаў іх 25–30 %. Што дапаможа нашым вачам? Пра гэта расказала ўрач-афтальмолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Наталля МАЦЕЙКА.**



— Дбаць пра здароўе дзіцяці і праводзіць прафілактыку для выключэння блізарукасці неабходна з ранняга дзяцінства. Пры моцнай нагрузцы на блізкай адлегласці мышцы вачэй знаходзяцца ў пастаянным напружанні. Гэта стымулюе рост вока ў даўжыню. Ступень блізарукасці прама прапарцыйная даўжыні вока: чым яно даўжэй, тым больш ступень міяпіі, — расказвае афтальмолаг.

Вось што будзе карысна ў прафілактыцы блізарукасці ў дзяцей. У першы год жыцця афтальмолаг павінен агледзець малога тры разы: у першыя тры месяцы, у паўгода і ў год. Агляд у год уключае пашыранне зрэнкі для вызначэння сапраўднай рэфракцыі. Дзецям з групы рызыкі (блізарукасць у блізкіх сваякоў, пры рэтынапатыі неданошаных і іншае), магчыма, неабходна будзе абследавацца ў акуліста часцей.

Бацькі павінны паклапаціцца, каб пакой дзіцяці быў светлым. Недапушчальна, каб дзіця гуляла з дробнымі прадметамі, малявала ці разглядала карцінкі пры дрэнным асвятленні.

Першыя кніжкі павінны быць з вялікімі і выразнымі карцінкамі для таго, каб не дапускаць перанапружання зроку. З ранняга дзяцінства дзіця павінна прывыкнуць маляваць і пісаць за сталом. Пры гэтым важна сачыць за яго паставай і адлегласцю ад вачэй да стала: яна раўняецца адлегласці ад кісці дзіцяці да локця.

Працоўны стол таксама павінен быць дастаткова асветлены пры дапамозе настольнай лямпы ці свяцільніка.

Малым да трох гадоў не рэкамендуецца глядзець тэлевізар. Дзецям старэйшага ўзросту пажадана на гэты занятак адводзіць не больш як 30 хвілін запар. Адлегласць ад экрана да вачэй павінна раўняцца тром дыяганалям тэлевізара. Гэтыя ж правілы адносяцца і да камп'ютараў.

Немалаважным з'яўляецца рацыянальнае харчаванне, якое ўключае ўвесь комплекс пажыўных рэчываў, неабходных для нармальнага развіцця арганізма. Для прафілактыкі блізарукасці асабліва карысная ежа, якая змяшчае вітаміны А, С і кальцый (малочныя прадукты).

### ПРАВІЛЫ ГІГІЕНЫ ЗРОКУ

Правільная арганізацыя глядзельнай нагрузкі і адпачынку (гігіена зроку) адыгрывае галоўную ролю ў прафілактыцы блізарукасці ў любым узросце. Выконваючы простыя правілы, можна дабіцца значных вынікаў у прафілактыцы блізарукасці.

- Чытанне лежачы, асабліва на баку, негатыўна ўплывае на зрок, паколькі ў такім становішчы вочы знаходзяцца на рознай адлегласці ад тэксту.
- Не рэкамендуецца практыкаваць і чытанне ў транспарце. Падчас руху вачам прыходзіцца пастаянна факусіравацца на новай адлегласці. А гэта вельмі стамляе мышцы вачэй.
- Для прафілактыкі блізарукасці важна добрае асвятленне ў памяшканні. Рэкамендуецца выкарыстоўваць лямпы дзённага святла, якія імітуюць натуральнае асвятленне. У дрэнна асветленым памяшканні значна зніжаюцца вастрыня зроку і кантрасная адчувальнасць.
- Рабочы стол таксама павінен быць добра асветлены. Пры выбары лямпы варта звярнуць увагу на яе абажур, які павінен быць конусападобным і непразрыстым. Траплянне прамых прамянёў святла неспрыяльна ўплывае на вочы. У лямпе варта выкарыстоўваць лямпачку магутнасцю ад 60 Вт.
- Не пажадана глядзець тэлевізар у поўнай цемры. Рэзкі перапад паміж яркім экранам і цёмным пакоем будзе стамляць вочы.
- Падчас работы за камп'ютарам рэкамендуецца размяшчаць экран крыху вышэй за ўзровень вачэй і на адлегласці 35-40 см. Шрыфт тэксту варта выбіраць 12-14 і маштаб 100 %. Пры наборы тэксту на камп'ютары дробным шрыфтам рэкамендуецца павялічыць маштаб.
- У зрокавай рабоце патрэбна рабіць перапынкі. Для прафілактыкі блізарукасці іх неабходна рабіць праз кожныя 45–50 хвілін бесперапыннай работы на пяць хвілін. Для выключэння прагрэсіравання ўжо наяўнай блізарукасці перыяд бесперапыннай работы варта скарацыць да 30–40 хвілін, а перапынак павялічыць да 10 хвілін.
- Наяўнасць прафесійных шкоднасцяў для органаў зроку (работа за камп'ютарам больш за чатыры гадзіны ў дзень, выкарыстанне ў рабоце дробных прадметаў) патрабуе штогадовага прафілактычнага агляду ў афтальмолага.

Станоўча ўплывае на стан органаў зроку трэніроўка акамадацыі.

— Акамадацыя — гэта працэс, які дазваляе вачам факусіравацца на прадметах, што размешчаны на далёкай і на блізкай адлегласці. Пры моцных глядзельных нагрузках акамадацыйныя мышцы ўвесь час знаходзяцца ў напружанні. Гэта спрые развіццю спазмы акамадацыі, што выяўляецца пагаршэннем зроку. Узнікае імітацыя блізарукасці ці яе ўзмацненне. З часам акамадацыйная спазма можа развіцца ў сапраўдную блізарукасць, — кажа Наталля Мацейка.

Існуе некалькі практыкаванняў, якія дазваляюць трэніраваць акамадацыю і спрыяюць прафілактыцы блізарукасці. Гэтыя практыкаванні можна выконваць прама на рабочым месцы. Напрыклад, можна маляваць розныя геаметрычныя фігуры позіркам. Вельмі карысная гімнастыка для вачэй, якую распрацаваў вядомы афтальмолаг прафесар Сяргей Авецісаў. Для дасягнення станоўчых вынікаў гімнастыку трэба выконваць рэгулярна: мінімум двойчы ў дзень па 3-5 хвілін.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот: капитальное строение с инвентарным номером 125/С-12711 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 34,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Ратайчицкий с/с, д. Борщёво, ул. Веры Хоружей, 5, на земельном участке с кадастровым номером 124085500601000065, площадью 0,2500 га, составные части и принадлежности: две холодных пристройки, три сарая, колодец** | | | |
| **Начальная цена, руб.** | **12 490,44** | **Размер задатка, руб.** | **1 249,04** |
| **Продавец:** ОАО «Беловежский», Брестская обл., Каменецкий р-н, аг. Беловежский, ул. Ленина, 2, тел. 80163172881. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены | | | |
| **Аукцион состоится 04 июня 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325** | | | |
| Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/23820), а также можно узнать по телефонам: 8 (0162)-40-87-01, 40-87-02 | | | |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00** | | | |

**Последний день приема заявлений – 03 июня 2024 г. до 17.00**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)* по поручению **ОАО «Сковшин»** *(Продавец)* проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ПОДНАВЕСА СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ МАШИН

**с инв. № 644/С-62552 общ. пл. 761,1 кв. м,**

**расположенного на земельном участке** *(право постоянного пользования, участок имеет ограничение в использовании: расположен в охранных зонах электрических сетей, пл. 0,0018 га)* **с кадастровым номером 625081304101000124 площадью 0,3224 га, по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Домановичский с/с, д. Осово, ул. Молодежная, 2А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **12 120,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 212,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001693 30000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **17.06.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.06.2024** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8017) 420-34-45, 8(029) 684-18-78.**

УНП 600072165

## ИНФОРМАЦИЯ

о проведении **28 мая 2024 года в 15.00** повторных аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего РУП «Торговый дом «Восточный»

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708179937, общей площадью 2878,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, тр-т Игуменский, 16-388, наименование и назначение – торговое помещение и установленные в нём системы и оборудование: система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре с инвентарным номером 2748, система водяного пожаротушения и система автоматизации с инвентарным номером 2749, система охранной сигнализации с инвентарным номером 2751, система контроля доступа с инвентарным номером 2753, система холодоснабжения с инвентарным номером 2756 | |
| **Начальная цена** – 8 179 347,14 бел. руб. с учетом НДС | **Размер задатка** – 817 934,71 бел. руб. |
| **Продавец имущества** – РУП «Торговый дом «Восточный», 220125, г. Минск, ул. Уручская, 14А, тел. +375 (17) 275 75 23. **Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел.: +375 (17) 365 48 36. | |
| **Срок и место приема заявлений: по 24.05.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА») | |

**Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **6 июня 2024 г. в 10.00** (Минская область, г. Березино, ул. Октябрьская, д. 39), Березинский сельисполком, зал заседаний |
| **Продавец и его адрес** | Березинский сельский исполнительный комитет, Минская область, г. Березино, ул. Октябрьская, д. 39 |
| **Земельный участок (количество), размер, его кадастровый номер и адрес** | **Лот 1** – участок площадью 0,3343 га, 620480404501000051, Минская обл., Березинский р-н, д. Мурово, ул. Береговая, д. 6А. **Лот 2** – участок площадью 0,2000 га, 620480406101000129, Минская обл., Березинский р-н, д. Прибрежная, ул. Набережная, д. 11А. **Лот 3** – участок площадью 0,5204 га, 620480408201000025, Минская обл., Березинский р-н, д. Снуя, ул. Туристическая, д. 9А |
| **Целевое назначение земельного участка** | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома) |
| **Начальная (стартовая) цена продажи** | **Лот 1** – 2 000,00 (две тысячи рублей 00 копеек); **Лот 2** – 3 000,00 (три тысячи рублей 00 копеек) **Лот 3** – 3 000,00 (три тысячи рублей 00 копеек) |

**Дополнительную информацию** по вопросам организации и проведения аукциона можно получить по телефонам: **+375 (1715) 68348, +375 (29) 6893864.**

Данное извещение размещается на официальных сайтах: Минского областного исполнительного комитета (minsk-region.gov.by), Минского городского исполнительного комитета (minsk.gov.by), Березинского районного исполнительного комитета (berezino.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (gki.gov.by).

УНП 600040856

## ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту: «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения по ул. Тимирязева в г. Минске» 2-я очередь строительства,** *опубликованную в газете «Звязда» от 08.02.2024 № 27 (30161)*

**Раздел «Информация об объекте строительства» дополнить пунктом 2.3.4.3. следующего содержания:**

«**2.3.4.3.** Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства в жилых домах по г.п. № 2.1 – 2.3 следующие объекты:

1) 4 квартиры в жилом доме по г.п. № 2.1. Проектные номера квартир, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м общей площади:

Проектная квартира № 10, общая площадь 126,43 кв. метра, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5600 белорусских рублей.

Проектная квартира № 56, общая площадь 111,69 кв. метра, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5900 белорусских рублей.

Проектная квартира № 61, общая площадь 119,69 кв. метра, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5500 белорусских рублей.

Проектная квартира № 62, общая площадь 67,97 кв. метра, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

2) 1 квартира в жилом доме по г. п. № 2.2. Проектный номер квартиры, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м общей площади:

Проектная квартира № 1, общая площадь 79,2 кв. метра, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5700 белорусских рублей.

3) 1 квартира в жилом доме по г. п. № 2.3. Проектный номер квартиры, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м. общей площади:

Проектная квартира № 12, общая площадь 109,54 кв. метра, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6200 белорусских рублей.

4) 1 машино-место (парковочное место) в жилом доме по г. п. № 2.1 (проектный номер машино-места № 14), стоимость строительства машино-места составляет 74100 белорусских рублей.

5) 2 машино-места (парковочное место) в жилом доме по г. п. № 2.3 (проектные номера машино-мест № 3, № 13), стоимость строительства машино-места составляет 66700 белорусских рублей.

6) 1 административно-торговое помещение № 2 в жилом доме по г. п. № 2.1 (АТП № 2, общей площадью 77,66 кв. метра). Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади предлагаемого административно-офисного помещения составляет 8200 белорусских рублей.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа, и условий оплаты строящегося жилого помещения, и иных факторов, влияющих на стоимость. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.»

УНП 192827731

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,** организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936), объявляет о проведении **27.05.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

Утерянный паспорт гражданина Афганистана № Р 04121175 от 07.11.2021 г. на имя Карими Мохаммеда Мухсен **считать недействительным.**

**Центр Промышленной Оценки**

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Магазин – 756,5 кв. м,** инв. № 640/С-111245. Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 98Д** | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,3632 га,** предоставлен на праве аренды (срок действия по 28.12.2034) для обслуживания здания магазина. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 В (пл. 0,0303 га) | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 378 240,00 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** календарных дней после подписания договора купли-продажи | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by) | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 2 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.04.2024 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.06.2024 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.06.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

**К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:**

**1) Объекты бывшего в/г: мастерская, наружная водопроводная сеть, тепловая сеть, объекты благоустройства (дорожка, проезд) по ул. Красноармейской, 52, в г. п. Россь, Росского с/с, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**2) Объекты бывшего в/г, комплекс № 12: здание АЗС, пункт газификации кислорода № 74 с пристройкой, объекты благоустройства, инженерные сети, около г. п. Россь, Росского с/с, 34, 34/1, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**3) Объекты бывшего в/г, комплекс № 14: здание СБВ лаборатории с беседкой, мощением, ограждением, калиткой, здание СБВ хранилища, около г. п. Россь, Росского с/с, 35, 35/1, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**4) Здание бани, наружные водопроводные и канализационные сети в Волковысском районе, Росского с/с, г. п. Россь, ул. Красноармейская, 44.**
Начальная цена предмета аукциона – 3 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

Аукцион состоится **27.05.2024 в 12.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **21.05.2024 до 16.00.**

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03;
в городе Гродно 8 (0152) 62 39 24, 62 39 32, 62 39 23.
Дополнительная информация размещена на сайте:
**https://au.nca.by**

УНП 500042135

## ОАО «МАПИД» ПРИГЛАШАЕТ ВСЕХ ЖЕЛАЮЩИХ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ БЫВШЕЙ В ЭКСПЛУАТАЦИИ ТЕХНИКИ

Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. 17, ОАО «МАПИД».

Окончание приема заявлений 16.05.2024 г. в 14.00.
Более подробная информация об аукционе на сайте **www.mapid.by** или по телефону **(8-017) 209-87-17.**

**Аукцион состоится 16.05.2024 в 14.00 по адресу: г. Минск ул. Р. Люксембург, 205, ОАО «МАПИД», каб. 39.**

- **ЛОТ 1: АВТОМОБИЛЬ ВИС-2347** (2006 г. в., инв. № 1415). Начальная цена – 3738,50 бел. руб.
- **ЛОТ 2: АСФАЛЬТОУКЛАДЧИК VOGELE Super 1603-1** (2005 г. в., инв. № 1177). Начальная цена – 169625,70 бел. руб.
- **ЛОТ 3: АВТОГРЕЙДЕР ГС-14.02** (2010 г. в., инв. № 1538). Начальная цена – 121625,70 бел. руб.

УНП 100008115

# АД МАГУТНЫХ КАРАНЁЎ ДА ЯРКАЙ КВЕЦЕНІ ГАЛІНАК...

## З гісторыі творчых дынастый Беларусі

**Працоўныя дынастыі ў Беларусі — добрая традыцыя. А вось творчыя — справа больш рэдкая, бо і таленты нараджаюцца не так часта, і дзеці ў іх, здольныя заняць месца побач са славутымі бацькамі.**

**Выхаваць таленавітае дзіця — вельмі складана! Колькі мы ведаем трагедый, калі амбіцыйныя бацькі ўпарта выхоўвалі вундэркінда, а ён не вытрымліваў нагрузкі... Здараецца, людзі, якія дасягнулі поспеху ў прафесіі, не разумеюць, калі іх дзіця выбірае іншы шлях. Згадаць Адама Рыгоравіча Багдановіча, таленавітага этнографа і педагога, які гэтак паблажліва ставіўся да спроб сына Максіма пісаць на «правінцыйнай» беларускай мове... Зноў жа няпроста таленавітаму дзіцяці «выйсці з ценю» славутых бацькоў. Але сем'і, дзе побач — таленты розных пакаленняў, дзе пануе творчая атмасфера і ўзаемная падтрымка, у Беларусі былі і ёсць. Давайце з нагоды Міжнароднага дня сям'і іх прыгадаем.**

### АРХІТЭКТАРЫ ЛЕВІНЫ



Сям'я Левіных.

Сёння творчай майстэрняй легендарнага архітэктара Леаніда Левіна кіруе яго дачка, вядомы архітэктар Галіна Левіна. Тое, што многія з работ бацькі і дачкі звязаныя з тэмай Вялікай Айчыннай вайны і генацыду, тлумачальна. Як успамінае Галіна Леанідаўна, *«у памяці бацькі заўсёды была карціна, калі ён разам з братам бег з Мінска падчас бамбёжак — з жанчынамі ўсёй вялікай сям'і Левіных: з маці, бабулямі, цёткамі, сястрычкамі».* Калі ствараўся мемарыяльны комплекс у Хатыні, Леанід Левін браў маленькую Галіну ў ліцейку, дзе адлівалі дошкі і тэксты, заўсёды вазіў з сабой і ў Хатынь. А над комплексам «Дзецям — ахвярам вайны» ў вёсцы Чырвоны Бераг на Жлобіншчыне бацька і дачка працавалі разам, Галіна была ў складзе творчай групы. Яна сцвярджае: *«Я люблю сваю сямейную гісторыю. Акрамя ўвагі і клопату, якія дарылі мне бацькі, гэта былі ўзаемаадносіны паміж дарослымі і маленькім, але ўжо паважаным чалавекам. Думаю, іх павага сфарміравала мой характар, паўплывала на здольнасць выбудоўваць узаемаадносіны з людзьмі ў будучым. Вядома, бацькі, абодва архітэктары, былі адданыя сваёй працы. У нашай сям'і заўсёды было разуменне, наколькі для чалавека важная яго справа. Бацька, акрамя стварэння вядомых мемарыялаў і помнікаў, узначальваў майстэрню па забудове цэнтра Мінска ў 80-я гады, працаваў над мноствам іншых аб'ектаў. Мама, Наталля Афанасьева, была архітэктарам Мінскага планетарыя ў парку Горкага, займалася генпланам Мінска. І цяпер яна з разуменнем і павагай ставіцца да маёй працы».*

Сёння Галіна Левіна, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, працягвае справу свайго бацькі. Як прыклад — Алея Праведнікаў народаў свету, мемарыял у Бабруйску, які адкрылі ў 2005 годзе, калі Леаніда Левіна, што пачаў працаваць над гэтым праектам, ужо не было ў жывых, але дачка давяла да завяршэння праект. І цяпер значыцца, што аўтар мемарыяльнага знака — архітэктар Галіна Левіна, кансультант — архітэктар Леанід Левін.

### АЛАДАВЫ: КАМПАЗІТАР, МАСТАЦТВАЗНАЎЦА, АРХІТЭКТАР



Сям'я Аладавых.

Не заўсёды прадстаўнікі творчай дынастыі рэалізоўваюцца ў адной галіне мастацтва... Прыклад таму — сям'я Аладавых. Мабыць, гэта адзіны прыклад, калі ў Мінску вуліца названая адразу ў гонар цэлай сям'і — бо ў ёй столькі выбітных прадстаўнікоў! Родапачынальнік дынастыі, кампазітар Мікалай Аладаў, з піцерскіх дваран, меў сваяцтва з кампазітарам Аляксандрам Глазуновым. Са сваёй будучай жонкай Аладаў пазнаёміўся, калі прыехаў у Беларусь працаваць у музычным тэхнікуме і ў 1928-м адправіўся ў фальклорную экспедыцыю. Заехалі з Язэпам Лёсікам да вясковых настаўнікаў у Парычах, што на Гомельшчыне... Там пазнаёміліся з іх дачкой Аленай, гожай і энергічнай выпускніцай Белдзяржуніверсітэта. Для Аладава гэта было каханне на ўсё жыццё.

Мікалай Аладаў стаў адным з арганізатараў і рэктараў беларускай кансерваторыі, Алена Аладава — дырэктарам сённяшняга Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі... У Мікалая і Алены Аладавых нарадзілася трое дзяцей: Вальмен, Гельмір і Радаслава. Незвычайныя імёны прыдумаў сябар сям'і, музыказнавец Юльян Дрэйзін, знаўца старажытных моў. Гельмір скончыў ГІТІС, стаў акцёрам. Радаслава — прафесар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, музыказнаўца. А Вальмен Аладаў закончыў Маскоўскі архітэктурны інстытут, доўгі час узначальваў праектны інстытут «Белгіпрагандаль», доктар навук. Менавіта па яго праектах пабудаваны спартыўны комплекс у Раўбічах, надзвычай наватарскі ў той час будынак Камароўскага рынку, універсамы «Цэнтральны», «Фрунзенскі», «Серабранка». Гэта далёка не ўсе таленавітыя прадстаўнікі сям'і. Калісьці ў Санкт-Пецярбургу сваякі Мікалая Аладава стварылі «малое кола Аладавых», цяпер кажуць пра «вялікае кола Аладавых», якое сягае да праўнукаў кампазітара. У дынастыі ёсць фізікі, рэстаўратары, мастакі, музыкі. Вынік не дзіўны. Радаслава Аладава так успамінае пра сваё выхаванне: *«Бацькі былі закончанымі працаголікамі, людзьмі, да кроплі адданымі сваёй справе. Я прывыкла ў дзяцінстве прачынацца — а з-за адвечнай цеснаты мой ложак стаяў у нагах бацькоўскага — ад размоў на прафесійныя тэмы, абмеркаванняў тых або іншых службовых сітуацый. Маім выхаваннем займаліся «ўсім светам» — у доме жыло шмат народу: абедзве маміны сястры з дзецьмі, асірацелая падчас вайны татава пляменніца, студэнтка Ганна, якая была на правах дачкі. Апроч таго, гасцявалі сябры братоў, Вальмена і Гельміра, нейкі час знаходзіліся дзеці маскоўскіх сяброў маіх бацькоў, якія сталі студэнтамі мінскіх ВНУ...»*

### АКЦЁРЫ УЛАДАМІРСКІЯ



**Уладзімір Уладамірскі з жонкай Кацярынай, Барыс Уладамірскі, яго жонка Галіна, сын Аляксандр.**

Калі я шукала ў архіве нешта цікавае пра легендарнага акцёра Купалаўскага тэатра Уладзіміра Уладамірскага, чый юбілей якраз святкаваўся, трапіла на яго ліст 1941 года: Уладамірскі, які са сваёй трупай апынуўся ў эвакуацыі, пакутліва шукаў сям'ю, якая засталася ў Мінску: «Сын — Борис Владимирович Владомирский-Малейко, студент театрального уч-ща, и мою жену арт-ку Екатерину Васильевну Замешину-Малейко». Барысу з маці давялося перажыць жахі акупацыі, сядзець пад бомбамі па некалькі дзён у выкапаных ямах. Але пасля вызвалення сям'я сустрэлася... Бацька і сын выйшлі на адну сцэну, захапляючы сваёй ігрой гледачоў. Але на гэтым выпрабаванні не скончыліся. У 1950-м па даносе Барыс за неасцярожныя словы быў арыштаваны, трапіў у лагеры... Яго маладая жонка, актрыса Галіна, у будучым рэжысёр Купалаўскага тэатра, нейкім цудам, пры падтрымцы тытулаванага свёкра, дабралася на спатканне да мужа ў сібірскі лагер. І гэта прайшло... Сям'я ўз'ядналася. І хутка на рэпетыцыі казкі «Лапці-самаскокі» ў Купалаўскім тэатры, якую ставіла Галіна Уладамірская, танцаваў маленькі Саша, сын Галіны і Барыса. Ён таксама стане артыстам, будзе служыць у Рускім тэатры імя Горкага. Тры пакаленні акцёраў Уладамірскіх упрыгожылі беларускую сцэну і назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю тэатра.

### СКУЛЬПТАРЫ ГУМІЛЕЎСКІЯ

Помнікі Кірыле Тураўскаму ў Гомелі, Францішку Багушэвічу ў Смаргоні, Максіму Багдановічу ў Ялце, Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу і Станіславу Манюшку каля Мінскай ратушы, Янку Купалу ў Маскве, алея бюстаў у Нясвіжы, кампазіцыя «Балет» каля Вялікага тэатра Беларусі, трыпціх «Сказ аб Нясвіжы», які знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі...



Сям'я Гумілеўскіх.

Усе гэтыя вядомыя аб'екты зроблены двума суаўтарамі, двума таленавітымі скульптарамі, бацькам і сынам Львом і Сяргеем Гумілеўскімі. У бацькі і сына прайшла не адна сумесная выстава, нават майстэрня ў іх мелася адна на дваіх. Сумесная выстава сямейнага тандэма «А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю» ў музеі Максіма Багдановіча адбылася, калі Леў Гумілеўскі-старэйшы ўжо сышоў з жыцця. Радок Багдановіча, які даў назву выставе, выказвае сутнасць творчасці абодвух скульптараў: любоў да роднай зямлі, пашану да яе гісторыі. У адной са сваіх апошніх гутарак, калі яго спыталі, ці хацеў бы ён, каб сын пайшоў па бацькавых слядах, Леў Гумілеўскі адказаў: *«Дзеці рэдка слухаюць бацькоў, як ні тлумач, што добра, а што — не. Мой сын не выключэнне. У скульптуры Сяргей пайшоў сваім шляхам. Але ж менавіта я прыцягнуў яго да мастацтва. Ён бачыў, што я дзень у дзень хадзіў у майстэрню, круглыя суткі ляпіў і не заўважаў падзей, што адбываліся тады ў грамадстве. Я жыў і жыву мастацтвам. Мой працоўны настрой прывабіў яго».* Сяргей Гумілеўскі, у сваю чаргу, падкрэсліваў: *«Па шэрагу прычын мы з бацькам над многімі праектамі працуем разам, тым больш праца ў адной майстэрні гэта прадугледжвае. Але я заўважаю, што почырк у скульптуры ў мяне свой. Гэта прыкметна па многіх дэталях. Нашы працы адрозніваюцца, і я ўпэўнены, што так павінна быць, бо ў кожнага аўтара сваё адчуванне формы, прасторы і часу».*

### КАРЫЗНЫ: ПАЭТ, КАМПАЗІТАР, МУЗЫКА

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч культуры паэт Уладзімір Карызна, адзін з аўтараў беларускага Дзяржаўнага гімна, не змог атрымаць музычную адукацыю, хоць быў надзвычай адораны: *«Самастойна засвоіў музычную грамату. Магу напісаць акампанемент, а мелодыю, аркестроўку выконваюць прафесіяналы. Памятаю, як падчас вучобы на трэцім курсе філфака БДУ свой музычны твор паказаў беларускаму кампазітару прафесару Анатолю Багатырову. Ён уважліва паслухаў яго і параіў мне паступаць вучыцца ў кансерваторыю».*



**Кампазітар Уладзімір Карызна.**

Затое сын паэта, таксама Уладзімір, які ў 1990-м закончыў кансерваторыю па класе кампазіцыі Яўгена Глебава, шмат песень стварыў на словы бацькі: «Белая яблыня», «На азёрах сініх», «Думай, чалавек», «Жураўліны досвітак», «Таемнасць цішыні»... *«Большасць маіх вакальна-харавых, песенных твораў напісана на вершы майго бацькі, Уладзіміра Карызны. Гэта чалавек, які вельмі дасканала адчувае слова, якое потым добра кладзецца на музыку. Бо не кожны верш можа стаць песняй, не кожная фраза, сказ кладуцца на музыку»*, — сцвярджае Уладзімір Карызна-малодшы.



**Паэт Уладзімір Карызна.**

Застаецца згадаць, што ўнукі паэта, Іван і Анастасія, таксама звязалі лёс з музыкай, сталі музыкантамі. Іван праславіўся як віртуоз-віяланчэліст, выйграў не адзін міжнародны конкурс.

**Так, універсальных рэцэптаў, як выхаваць талент, няма, але з гісторый нашых герояў можна зрабіць высновы: нішто не заменіць асабістага прыкладу бацькоў. Іх апантанасць сваёй працай, любоў да прафесіі не могуць не паўплываць, тым больш калі дзіця не выштурхоўваюць за дзверы, каб не перашкаджала, а наадварот, далучаюць да ўсяго, што цікава самім. Няхай жа і ў вашых сем'ях, шаноўныя чытачы, пануюць узаемная падтрымка і настрой да сумеснай творчасці.**

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Спорт-тайм

# БЕЛАРУСКІЯ БАРЦЫ І ВЕСЛЯРЫ ЗАВАЯВАЛІ АЛІМПІЙСКІЯ ЛІЦЭНЗІІ

У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем цікавыя спартыўныя навіны

**ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ.** Беларуска Аліна Гарнасько заваявала чатыры медалі на першым этапе сусветнага Кубка выкліку па мастацкай гімнастыцы, які праходзіў у Партугаліі. У практыкаванні з абручом Аліна набрала 33,200 бала, што забяспечыла ёй трэцяе месца. У практыкаванні з мячом Аліне Гарнасько роўных не было, яе «залатая» адзнака — 33,500 бала. Сярэбраны медаль беларуская спартсменка заваявала ў кампазіцыі з булавамі (33,650 бала). Другое месца яна заняла і ў мнагабор'і. Другі і заключны этапы сусветнага Кубка выкліку па мастацкай гімнастыцы пройдзе ў сярэдзіне ліпеня ў румынскім Клуж-Напаку. Перад ім грацый чакае пяты этап Кубка свету, які з 21 па 23 чэрвеня прыме Мілан.

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія спартсмены завяршылі выступленні на сусветным кваліфікацыйным турніры па барацьбе, які з 9 па 12 мая прымаў Стамбул. Пуцёўкі на Алімпіяду-2024 атрымлівалі па тры найлепшыя спартсмены ў кожнай з шасці вагавых катэгорый у вольнай, грэка-рымскай і жаночай барацьбе. Алімпійскія ліцэнзіі на гэтым турніры заваявалі чацвёра беларусаў: барэц вольнага стылю Нюргун Скрабін (да 65 кг), барцы грэка-рымскага стылю Кірыл Маскевіч (да 87 кг) і Павел Глінчук (да 130 кг), а таксама Веранiка Іванова (да 62 кг). Усяго на Алімпіяду кваліфікаваліся 10 нашых барцоў, на красавіцкім еўрапейскім адборы ў Баку ліцэнзіі атрымалі Ірына Курачкіна (да 57 кг), а таксама «вольнікі» Арыян Цютрын (да 57 кг), Магамедхабіб Кадзімагамедаў (да 74 кг), Аляксандр Гуштын (да 97 кг) і Дзяніс Храмянкоў (да 125 кг). Па выніках чэмпіянату свету 2023 года ўдзельнікамі Гульняў у Парыжы сталі Ванэса Каладзінская (да 53 кг) і Абубакар Хаслаханаў (да 97 кг, грэка-рымская).

**ЛІЦЭНЗІІ ТЫДНЯ.** У Сегедзе прайшоў еўрапейскі кваліфікацыйны турнір па веславанні на байдарках і каноэ на Алімпійскія гульні 2024 года. У беларусаў — тры ліцэнзіі. На дыстанцыі 1000 м сярод байдарак-адзіночак перамогу ў вырашальным заездзе заваяваў Алег Юрэня. У фінале каноэ на 200 м найлепшы час паказала 21-гадовая гамяльчанка Юлія Трушкіна. Ангеліна Бардануўская і Вольга Клімава сталі найлепшымі ў заездзе каноэ на 500 м.

**МЕДАЛЬ ТЫДНЯ.** Беларус Ягор Варапаеў стаў пераможцам сёмага ў гэтым сезоне турніру серыі Вялікага шлема па дзюдо, які прайшоў у Астане. На спаборніцтвах выступілі 450 спартсменаў з 85 краін. Беларускую каманду прадставілі тры дзюдаісты — Дар'я Канцавая (в/к да 78 кг), Руслан Галавачоў (да 73 кг) і Ягор Варапаеў (да 90 кг). Медаль удалося заваяваць толькі Варапаеву. Гэта ўзнагарода сярыі турніраў Вялікага шлема сёлета стала для беларускай каманды першай: раней найлепшым вынікам было пятае месца Дар'і Канцавой на лютаўскіх спаборніцтвах у Парыжы.

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** Шэсць медалёў заваявалі беларускія спартсмены на чэмпіянаце Еўропы па самба сярод юнакоў і дзяўчат. Сярэбраныя медалі заваявалі Вера Мінчэня (да 54 кг), Дар'я Навіцкая (да 59 кг) і Мар'яна Жукавец (да 80 кг), бронзавымі прызёрамі сталі Крысціна Еўсюк (да 65 кг), Паліна Лук'янчук (звыш 80 кг) і Яўген Клімашэўскі (да 98 кг). Напярэдадні ў Нові-Садзе адбыўся кантынентальны форум па самба сярод юніёраў і юніёрак, дзе беларускія спартсмены таксама выйгралі шэсць узнагарод (усе бронзавыя). 9 і 10 мая Сербія прымала дарослы чэмпіянат Еўропы, з якога беларусы прывезлі 14 медалёў (адзін залаты, шэсць сярэбраных і сем бронзавых). Адзіным з беларускай каманды ўладальнікам залатога медаля стаў Уладзіслаў Бурдзь (да 58 кг).

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Юнацкая зборная Беларусі (U-15) стала пераможцам турніру развіцця УЕФА ў Ерэване. У заключным матчы яны абгулялі равеснікаў з Малдовы з вынікам 2:0. У стартавым паядынку беларускія футбалісты перамаглі каманду Кіпра з вынікам 3:1, затым саступілі ў серыі пасляматчавых пенальці гаспадарам спаборніцтваў — армянскім футбалістам — 5:6 (асноўны час завяршыўся з лікам 2:2).

Нядаўна турніры развіцця УЕФА адбыліся ў Мінску. Юнацкая зборная Беларусі (U-16) стала пераможцам, апярэдзіўшы каманды Узбекістана, Таджыкістана і Азербайджана. У спаборніцтвах дзяўчат беларускія футбалісткі занялі другое месца, саступіўшы першынство турчанкам.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**



## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.07 | 21.06 | 15.59 |
| Віцебск — | 4.50 | 21.02 | 16.12 |
| Магілёў — | 4.56 | 20.57 | 16.01 |
| Гомель — | 5.00 | 20.46 | 15.46 |
| Гродна — | 5.23 | 21.21 | 15.58 |
| Брэст — | 5.31 | 21.14 | 15.43 |

### Месяц

*Першая квадра ў 14.48. Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

*Пр. Зоі, Апанаса, Барыса, Глеба, Давыда, Рамана. К. Надзеі, Софі'і, Ізыдора, Яна.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## ЗАЎТРА




## 15 МАЯ

Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1845** год — нарадзіўся Ян Чэрскі, беларускі геолаг і даследчык Сібіры. Праводзіў даследаванні ваколіц Омска, вывучаў будову берагоў Байкала, склаў першую геалагічную карту яго ўзбярэжжа, даследаваў басейны рэк Селенга і Ніжняя Тунгуска, вывучаў Саяны і Прыангар'е. У 1885-м па запрашэнні Пецярбургскай акадэміі навук пераехаў у Санкт-Пецярбург, па дарозе зрабіў маршрутнае геалагічнае даследаванне паштовага тракту ад Іркуцка да Урала. Узнагароджаны трыма залатымі медалямі Расійскага геаграфічнага таварыства.

**1882** год — нарадзіўся Уладзіслаў Галубок, беларускі тэатральны дзеяч, рэжысёр, драматург. «У 1896 годзе за грошы, зробленыя на выгрузцы дроў, я набыў білет на галёрку мінскага тэатра. Там і ўзнікла ў мяне думка стаць артыстам...» — расказваў сам Галубок. Аўтар публіцыстычных і тэатразнаўчых артыкулаў. Вядомы як мастак-дэкаратар і пэйзажыст. Першы народны артыст БССР (1928).

**1905** год — Янка Купала дэбютаваў у друку з вершам «Мужык». Верш быў змешчаны на старонках газеты «Северо-Западный край».



**1979** год — у Мінску адкрыўся Музей старажытнабеларускай культуры. Заснаваны ў 1977 годзе на базе Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР як цэнтр вывучэння і прапаганды беларускай мастацкай спадчыны.

У свеце

**1157** год — на балі ў кіеўскага баярына Пятрыы атручаны князь Суздальскі і Кіеўскі Юрый Далгарукі.



**1252** год — Папа Рымскі Інакенцій IV абвясціў буллу «Ad extirpanda», якая дазваляла інквізіцыі катаваць падазраваных у ерасі, перад тым як адпраўляць іх на вогнішча.

**1618** год — нямецкі астраном Іаган Кеплер адкрыў законы руху планет. Тры эмпірычныя суадносіны, вызначаныя ім, дазволілі Ньютану пастуліраваць закон сусветнага прыцягнення, які стаў фундаментальным у класічнай механіцы.

**1845** год — нарадзіўся Ілья Мечнікаў, рускі і французскі біёлаг і імунолаг, заснавальнік навуковай геранталогіі, нобелеўскі лаўрэат (1908).

Так гаварыў...

**МАРК АЎРЭЛІЙ:**

*«Праблема ў тым, што, не рызыкуючы, мы рызыкуем у сто разоў больш».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Два сябры гутараць пра сваё сямейнае жыццё.**

**— Вось ужо пятнаццаць гадоў, як жанаты, — кажа адзін. — Спачатку я так яе прыцiскаў і цалаваў, што яна баялася, як бы не задушыў.**

**— А цяпер? — пытае прыяцель.**

**— Відаць, справа да гэтага і ідзе!**

— Бабуля! Колькі кіламетраў да суседняй вёскі?

— Пяць было. А потым прыехалі спецыялісты і намералі сем. Цяпер ходзім лішнія два кіламетры.

**— Ідзі паглядзі, чым там котка на кухні грыміць.**

**— А ты яе карміла?**

**— Не.**

**— Значыць, гатуе нешта.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.746. Індэкс 63850. Зак. № 1082.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 мая 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12